**В.І.Саітава,** *кандыдат педагагічных навук, дацэнт*

# ФУНКЦЫІ КРАЯЗНАЎЧАГА ДАВЕДАЧНА-БІБЛІЯГРАФІЧНАГА АПАРАТУ БІБЛІЯТЭКІ Ў КАНТЭКСЦЕ БІБЛІЯКАМУНІКАЦЫІ

Бібліяграфічная камунікацыя як “адносна аўтаномная падсістэма ў цэласнай сістэме трансляцыі сацыяльных ведаў” [5, с. 65] і разнавіднасць бібліякамунікацыі вызначаецца арганізаваным і адначасова спантанным рухам бібліяграфічных метатэкстаў. Іх шчыльнасць у камунікатыўным патоку неаднолькавая, існуюць своеасаблівыя вузлы, якія вызначаюцца высокай канцэнтрацыяй. Упарадкаваныя масівы бібліяграфічных метатэкстаў аб рэгіёнах канцэнтруюцца ў краязнаўчым даведачна-бібліяграфічным апараце (КДБА) бібліятэк.

КДБА не атрымаў прызнанага азначэння, што звязана з неаднназначнасцю і дыскусійнасцю зыходнага паняцця “даведачна-бібліяграфічны апарат”[1]. А.В.Мамантаў, М.М.Шчэрба, Н.Ф.Гарбачэўская, Р.М.Чыгірова, А.І.Коган, А.М.Маслава і іншыя, выкарыстоўваючы тэрмін “КДБА”, не падавалі яго азначэння, абмяжоўвалі канстатацыяй функцыянавання і апісаннем састаўных частак. Такі ж падыход у вучэбнай і метадычнай літаратуры, напрыклад: “Краеведческий справочно-библиографический аппарат (КСБА) является важной составной частью универсального справочно-библиографического аппарата (СБА) библиотеки… В структуре его различаются такие основные части, как: система каталогов и картотек; фонд справочных и библиографических изданий; фонд (архив) выполненных справок…” [2, с. 162]. Адзначаюць асаблівасці КДБА як абумоўленыя “задачами и целями краеведческой работы в целом, особенностями литературы о крае и местных изданий” [2, с. 162] і інш.

Сёння актуальным уяўляецца разгляд камунікатыўнага патэнцыялу КДБА як сродку трансляцыі назапашаных рэгіянальнай супольнасцю дакументаваных гісторыка-культурных каштоўнасцей, як крыніцы інфармацыйнага забеспячэння сучаснага ўстойлівага развіцця рэгіёнаў. Насельніцтва пэўнага рэгіёну

[1] У стандарце 7.0-99 “Інфармацыйна-бібліятэчная дзейнасць, бібліяграфія” даецца наступнае азначэнне ДБА: “Даведачна-бібліяграфічны апарат – гэта даведачна-пошукавы апарат, які ўключае бібліяграфічныя дапаможнікі”.

БІБЛІЯТЭКА БГУКІ

(населенага пункта), якое можна аднесці да вялікіх сацыяльных груп па тэрытарыяльнай прымеце, стварае значымыя сацыяльныя сэнсы (веды, традыцыі, тэхналогіі, метады лячэння і інш.), што трансліруюцца з пакалення ў пакаленне рознымі шляхамі, у тым ліку як дакументаваныя веды. КДБА выражае ў бібліяграфічным праяўленні здабыткі сацыяльнай памяці рэгіянальнай супольнасці. Паспрабуем удакладніць яго азначэнне ў камунікатыўным кантэксце: “КДБА – гэта ІПС у дакументнай ці/і электроннай форме, прызначаны для аптымізацыі камунікатыўных сувязей паміж аўтарамі, дакументальнымі крыніцамі краязнаўчых ведаў і карыстальнікамі”. Такое разуменне дазваляе ўдакладніць сутнасць і функцыянальны патэнцыял КДБА.

Камунікатыўны характар найперш праяўляецца ў КДБА ў тым, што ён ствараецца з мэтай камунікацыі, на ўсіх этапах свайго функцыянавання КДБА разлічаны на патэнцыяльных карыстальнікаў. Кожны структурны элемент, кожная структурная адзінка (нават на ўзроўні асобнага бібліяграфічнага запісу) адрасаваны патэнцыяльным карыстальнікам. Таму КДБА выступае пасрэднікам паміж краязнаўчымі тэкстамі, іх аўтарамі і аўдыторыяй карыстальнікаў. Назапашаныя дакументаваныя веды аб рэгіёне як вынік пазнавальнай дзейнасці мноства індывідуальных аўтараў і калектываў у КДБА перадаюцца на метаінфармацыйным узроўні неабмежаванаму колу індывідуальных і групавых карыстальнікаў. Экстрапаліруючы погляды В.А.Факеева на ролю камунікатыўнай функцыі бібліяграфічнай інфармацыі, магчыма вызначыць яе ў якасці асноўнай функцыі КДБА з падфункцыямі абвяшчэння і пошуку дакументаў аб рэгіёне [5, с. 68]. Функцыя абвяшчэння праяўляецца ў той упарадкаванай, арганізаванай, лагічна звязанай структуры бібліяграфічных метатэкстаў, згорнутых фактаграфічных тэкстаў у даведачных выданнях, фактаграфічных картатэках і БД, якія адлюстроўваюць дасягненні вывучэння і развіцця рэгёнаў і бесперапынна папаўняюцца новымі апрацаванымі на другасным узроўні краязнаўчымі сэнсамі. Функцыя абвяшчэння непарыўна звязана з пошукавай. Пошукавая дзейнасць карыстальнікаў ва ўсіх сваіх мэтах і іншых праяўленнях рэалізуецца на падставе другасных краязнаўчых паведамленняў, атрыманых з дапамогай КДБА. Навуковая і метадычная распрацоўка кожнага элемента КДБА і яго практычная рэалізацыя маюць на мэце як падтрымку пошукавых алгарытмаў, так і засваенне карыстальнікамі. Тэхналогія і арганізацыя КДБА

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

дазваляюць наладзіць дыялог, накіраваны на эфектыўную трансляцыю бібліяграфічных метатэкстаў. Прадстаўлены ў бібліятэках у карткавых і электронных формах, КДБА – агульнадаступны, бесперапынна папаўняецца, адлюстроўваючы змяненні інфармацыйных патрэбнасцей карыстальнікаў, а таксама аб’ектаў камплектавання і бібліяграфавання.

У функцыянальным патэнцыяле КДБА важную ролю рэалізуюць мнемічная, сацыяльна-прасторавая, каштоўнасна-арыентацыйная і іншыя функцыі. Бібліяграфічныя метатэксты, упарадкаваныя ў КДБА, фіксуюць і захоўваюць духоўныя здабыткі аб развіцці рэгіянальнай супольнасці (мнемічная функцыя). Назва геаграфічнага аб’екта, з якім чалавек звязаны нараджэннем, падзеямі жыцця, – гэта таксама асноўны сімвал, код (як этнас, веравызнанне і інш.), што абуджаюць глыбінную эмацыянальную прыхільнасць да пэўнага месца, дапамагаюць аб’яднанню людзей з розных канцоў свету, стымулююць іх пазнавальную актыўнасць.

Краязнаўчыя каталогі, бібліяграфічныя дапаможнікі і іншыя элементы КДБА садзейнічаюць распаўсюджванню ў сацыяльнай прасторы актуальных ведаў аб рэгіёне, яны ж, як і дзейнасць бібліяграфічнага абслугоўвання па краязнаўстве на аснове КДБА, накіраваны на выхаванне патрыятычных пачуццяў, высокіх грамадзянскіх эмоцый, сацыяльна арыентаваных паводзін, стымуляванне пазнавальнай і практычнай дзейнасці людзей па паляпшэнні ўзроўню развіцця рэгіёнаў, якасці жыцця, укараненне навацый (сацыяльна-прасторавая і каштоўнасна-арыентацыйная функцыі). КДБА на другасным (бібліяграфічным і фактаграфічным) узроўні ўплывае на светапогляд карыстальнікаў, фарміруючы не толькі патрыятычныя пачуцці, але і спецыфічны інфармацыйна-рэгіянальны стыль і логіку мыслення. Напрыклад, новыя рубрыкі і ключавыя словы электроннага (карткавага) краязнаўчага каталогу (прысвечаныя бягучым з’явам эканомікі, грамадскага жыцця і культуры рэгёнаў, актуалізаваным пытанням гістарычнага мінулага) акцэнтуюць увагу на дынамічных працэсах сацыяльна-эканамічных і культурных пераўтварэнняў, на ўкладзе краю ў развіццё краіны, а гістарычная тэматыка абуджае беражлівыя адносіны да здабыткаў папярэдніх пакаленняў, пошукі магчымасцей выкарыстаць гістарычны вопыт як рэсурс перспектыўнага развіцця.

Акцэнтаванне значэння камунікатыўнай функцыі КДБА, трансфармацыя яго іншых важных сацыяльных функцый, сам ён як

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

цэласны, завершаны ў межах бягучага часу элемент бібліякамунікацыі – усё гэта ўтварае патэнцыял пераадолення шматлікіх камунікатыўных бар'ераў, што паўстаюць перад карыстальнікамі на шляху да ведаў і дакументаў.

Пераадоленню прасторавых, геаграфічных, колькасных, зместавых бар'ераў садзейнічаюць амаль усе элементы КДБА. Зводныя краязнаўчыя каталогі змяшчаюць указанні на месцазнаходжанне дакументаў[2]. Вывад элементаў КДБА ў Інтэрнеце спрыяе пераадоленню геаграфічных бар'ераў, з'яўленню аддаленых карыстальнікаў. Уключэнне ў КДБА такіх дапаможнікаў, як бібліяграфічныя нарысы, дайджэсты, энцыклапедыі, папулярныя даведнікі, спрыяе пераадоленню зместавай ці стылістычнай недаступнасці першасных тэкстаў для некаторых карыстальнікаў. Рэкамендацыйныя і навуковыя краязнаўчыя дапаможнікі ў КДБА садзейнічаюць пераадоленню якасных перашкод, звязаных з рэалізацыяй каштоўнаснай арыентацыі суб'екта ў свеце краязнаўчых тэкстаў, з неабходнасцю параўнання, ацэнкі і выбару найбольш якасных дакументаў.

Паспяхова садзейнічае КДБА пераадоленню асноўных камунікатыўных бар'ераў, якія залежаць ад карыстальнікаў: стратэгічна-пошукавых, псіхалагічных, храналагічных, эканамічных. Стратэгічна-пошукавыя перашкоды, калі карыстальнік самастойна не можа стварыць правільны алгарытм пошуку інфармацыі, мінімізуюцца з дапамогай уніфікаванай структуры краязнаўчых сістэматычных і іншых каталогаў і картатэк, аб'яднаных АПУ, прадуманай структуры бібліяграфічных дапаможнікаў, сістэмы дапаможных паказальнікаў да іх, сервісу ў электронных краязнаўчых каталогах і БД. Важную ролю адыгрываюць метадычныя матэрыялы ў дапамогу выкарыстанню элементаў КДБА, сродкі навучання карыстальнікаў. Псіхалагічныя бар'еры: непрыхільныя адносіны да пэўных аўтараў, тэматыкі, жанраў ці іншыя – могуць быць паспяхова пераадолены ў працэсе гутаркі, кансультацыі ці іншых формаў бібліяграфічных зносін на падставе КДБА. Сама сутнасць і ўсе тэхналагічныя працэсы вядзення КДБА прызначаны для пераадолення храналагічных бар'ераў дзеля эканоміі часу карыстальнікаў на пошук краязнаўчай інфармацыі. Такім чынам, КДБА як інфармацыйны пасрэднік па

[2] Па стане на бягучы час зводныя краязнаўчыя каталогі беларускіх бібліятэк патрабуюць вялікай дапрацоўкі.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

сутнасці і функцыянальным патэнцыяле выконвае адметную ролю ў працэсе бібліякамунікацыі.

---

*1. Вохрышева, М.Г.* Теория библиографии: учеб. / М.Г.Вохрышева. – Самара: Изд-во СГАКИ, 2004. – 368 с.

*2. Мамонтов, А.В.* Краеведческая библиография: учеб. / А.В.Мамонтов, Н.Н.Щерба. – М., 1989. – 216 с.

3. *Основы* теории коммуникации: учеб. пособие / под ред. М.А.Василика. – М.: ГАРДАРИКИ, 2006. – 615 с.

4. *Соколов, А.В.* Общая теория социальной коммуникации: учеб. пособие / А.В.Соколов. – СПб.: Изд-во Михайлова В.А., 2002. – 461 с.

5. *Фокеев, В.А.* Природа библиографического знания / В.А.Фокеев. – М.: Изд-во Рос. гос. б-ки, 1995. – 351 с.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ